**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за верасень 2016 г.**

**<u>Мерапрыемствы ў рамках раённага рэкламнага тыдня “Бібліятэка ў пошуках ўласнага аблічча”</u>**

**8 верасня**

Бібліятэкары раёна прынялі ўдзел у творчай лабараторыі “Неделя библиотечной рекламы как возможность привлечения новых пользователей”, дзе падзяліліся планамі правядзення бібліятэчнага рэкламнага тыдня, прапанавалі інавацыйныя ідэі правядзення рэкламных мерапрыемстваў, пазнаёміліся з метадычнымі рэкамендацыямі па тэме. Падведзены вынікі раённага конкурсу на лепшую пастаноўку працы з дзецьмі і падлеткамі ў летні перыяд “Каникулы в библиотеке”. Дыпломамі ўзнагароджаны Дзіцячы і Дзівінскі філіялы і Батчынская публічная інтэграваная бібліятэка.

ЦРБ, 62 чал.

**14 верасня**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры для навучэнцаў СШ №1 прайшла інфармацыйна-пазнавальная гадзіна “Сокровищница всех богатств человеческого духа”. Супрацоўнікі бібліятэкі паказалі відэаролік рэкламы паслуг цэнтральнай бібліятэкі і відэапрэзентацыю пра самыя незвычайныя бібліятэкі свету, раздалі рэкламныя буклеты з правіламі карыстання бібліятэкай.

ЦРБ, 80 чал.

**15 верасня**

Шэраг бібліятэк ДУК правялі Дзень самакіравання “Я - сёння бібліятэкар”, “Библиотекарь – значит креативный”, “Чытач за бібліятэчнай кафедрай”.

**18 верасня**

Бібліятэкарамі праведзены шэраг мерапрыемстваў для карыстальнікаў рознага ўзросту. На працягу тыдня дэманстравалася відэапрэзентацыя “Наши будни и праздники”, праводзіўся інфармацыйны агляд “Библиотека предлагает…”. Супрацоўнікі прымалі віншаванні ад удзячных чытачоў. Завяршыўся Тыдзень рэкламы святочнай акцыяй “Желаем тебе, библиотека!”. Афармлены кніжныя выставы: выстава-прагляд “Есть имена и есть такие даты” і выстава-сюрпрыз “Прочитай то, не знаю что...”.

Гарадзецкі філіял, 58 чал.

**18 верасня**

У час правядзення экскурсіі "Жыві, кніга!" дзеці даведаліся, што такое бібліятэка, адказалі на пытанні казачнай гульні-віктарыны і здзейснілі відэавандраванне па самых прыгожых бібліятэках свету. Экскурсія завяршылася наведваннем пакоя народнай творчасці.

Тэвельская ПБ, 33 чал.

**Мерапрыемствы да Дню беларускага пісьменства**

**11 верасня**

У бібліятэцы адбылося свята кнігі “Пад сонцам Скарыны”, прысвечанае 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. У ходзе мерапрыемства прайшло відэападарожжа па старонках жыцця і творчасці беларускага першадрукара, відыяпрэзентацыя "Шуміць Скарынаўскае свята". Прадстаўлена кніжная выстава "Францыск Скарына - беларускі асветнік". На выступленні ЛПГ "Ліра" гучалі вершы аб роднай мове. Музычныя нумары падрыхтаваны вакальнай групай "Зорачкі" і народным ансамблем песні "Ясніца" Стрыгаўскага Дома культуры.

Стрыгаўская ПБ, 57 чал.

**11 верасня**

Для старшакласнікаў праведзены бібліятэчны ўрок “Аб чым не паведаў падручнік”, прысвечаны Дню беларускага пісьменства. Дзеці пазнаёміліся з сусветнай гісторыяй кнігадрукавання і гісторыяй беларускай кнігі, чыталі ўрыўкі з твораў беларускіх асветнікаў, пабывалі ў віртуальным музеі кнігадрукавання ў Полацку і сутыкнуліся з гісторыяй праз бібліятэчныя артэфакты - кнігі на царкоўнаславянскай мове XIX стагоддзя і аўтэнтычныя беларускія акапэльныя спевы.

Дзівінскі філіял, 47 чал.

**13 верасня**

Бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу падрыхтавала літаратурна-музычную кампазіцыю “Які ж гэта цуд – мова мая!”, прысвечаную 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. Навучэнцы 7-9 класаў даведаліся пра гісторыю кнігадрукавання, пра Францыска Скарыну, прынялі ўдзел у віктарыне. Да ўвагі ўдзельнікаў прапанавана кніжная выстава «Духоўная спадчына Скарыны».

Астроміцкая ПБ, 65 чал.

**26 верасня**

Бібліятэка сумесна з кінатэатрам “Вясёлка” правяла гадзіну літаратурнага партрэта “У гасцях у Францыска Скарыны”, прысвечаную 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. У мерапрыемстве ўдзельнічалі вучні старэйшых класаў ДУА «Сярэдняя школа №9 г. Кобрына».

Супрацоўнікі бібліятэкі разам з гасцямі прагарталі старонкі біяграфіі Францыска Скарыны, пазнаёміліся з сусветнай гісторыяй кнігадрукавання і гісторыяй беларускай кнігі. Мерапрыемства завяршылася праглядам фільма “Першадрукар” аб жыцці і дзейнасці Францыска Скарыны.

ЦРБ, 28 чал.

**Мерапрыемствы ў рамках правядзення Тыдня міру**

**22 верасня**

Бібліятэкарамі арганізаваны гадзіна міласэрнасці “Впустите в сердце добро!”. Карыстальнікі малодшага школьнага ўзросту пазнаёміліся з гісторыяй Міжнароднага дня міру, кнігамі, якія апавядаюць пра мір і сяброўства. Дзеці прымалі актыўны ўдзел у конкурсе малюнкаў “Мир такой

родной и разный”, у вырабе папяровых птушак, у выкананні песні “Пусть всегда будет солнце” і прагледзелі відэапрэзентацыю “Всем нужен мир!”.

Гарадзецкі філіял, 22 чал.

**22 верасня**

Для падапечных дзённага знаходжання ТЦСАН ў інфармацыйна-сэрвісным цэнтры прайшла інфармацыйна-пазнавальная гадзіна “Вместе на благо мира”. Вядучыя распавялі пра гісторыю ўзнікнення Дня міру, аб знакамітых людзях рознага рангу, сферы дзейнасці, нацыянальнасцяў і культур, якія выконваюць абавязкі паслоў добрай волі ААН.

ЦРБ, 15 чал.

**22 верасня**

Бібліятэкарамі праведзены шэраг мерапрыемстваў для карыстальнікаў рознага ўзросту. На працягу тыдня дэманстраваўся відэаролік “Мир, который нужен нам!”, праводзіўся бібліятэчны ўрок “День мира - праздник всей земли”. Для маленькіх выхаванцаў дзіцячага дома арганізаваны бібліятэчны дэсант “Подари улыбку миру”, падчас якога дзеці слухалі творы пра мір, сяброўства, дабро і ўдзельнічалі ў гульні “Ангелочек – наш дружочек”. Аформлена выстава дзіцячых вырабаў “Как прекрасен этот мир!”.

Дзівінскі філіял, 78 чал.

**22 верасня**

У Міжнародны дзень міру бібліятэкар правяла вусны часопіс “Мы мечтою о мире живём”. Навучэнцы сярэдніх класаў даведаліся пра гісторыю паходжання свята, праслухалі ўрыўкі з твораў пра вайну, прагледзелі відэаролікі пра гарачыя пункты планеты. Бібліятэкар правяла прэзентацыю выставы “Следы войны на Земле”. Дзеці склалі ліст чалавецтву з заклікам захоўваць свет на планеце і адправілі яго з галубамі свету.

Залеская ПБ, 37 чал.

**25 верасня**

У бібліятэцы прайшоў урок міру “Мир нужен всем”. Дзеці даведаліся пра гісторыю паходжання Міжнароднага дня міру, чыталі вершы пра мір, знаёміліся з кнігамі пра вайну, мір, сяброўства. Урок суправаджаўся дэманстрацыяй электроннай прэзентацыі “Голубь – символ мира”. Увазе карыстальнікаў бібліятэкі падрыхтавана кніжная выстава “Через книгу к миру и согласию”. Малодшыя школьнікі прынялі актыўны ўдзел у конкурсе малюнкаў “Мы рисуем мир”.

Батчанская ПБ, 24 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**1 верасня**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры адбыўся Дзень ведаў “Беларусь – мая Айчына”. Прысутнічалі навучэцы шасці класаў СШ № 8 г. Кобрына. Вучні чыталі вершы, актыўна ўдзельнічалі ў віктарыне, дзелавой гульне, розных конкурсах. Прысутныя праглезделі медыяпрэзентацыю “Благаславёныя Скарынай” і відэаролік “500 гадоў гісторыі беларускага кнігадрукавання”.

ЦРБ, 152 чал.

**4 верасня**

Бібліятэка сумесна з Домам культуры правяла свята чытання “Прощай, лето! Здравствуй, школа!”. Дзеці здзейснілі вандраванне па станцыях “Геаграфія”, “Матэматыка”, “Літаратура”, прынялі актыўны ўдзел у віктарыне “Что узнал я этим летом в библиотеке?”, у тэматычных гульнях і конкурсах, чыталі вершы пра школу і пра лета, адгадвалі загадкі і рэбусы. Увазе карыстальнікаў бібліятэкі прадстаўлены кніжная выстава “Здравствуй, школьная пора”, выстава малюнкаў “Мое лето” і фотавыстава “Прощай, лето”. Лепшыя чытачы бібліятэкі ўзнагароджаны памятнымі падарункамі.

Батчанская ПБ, 45 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81